Такім чынам, актывізацыя пазнавальнай дзейнасці ў працэсе рэферыравання была накіравана на ажыццяўленне сувязі англійскай мовы са спецыяльнымі дысцыплінамі. Рэалізацыя міжпрадметных сувязяў дазволіць студэнтам выкарыстоўваць замежную мову на практыцы і будзе садзейнічаць павышэнню іх цікавасці да будучай прафесіі.

Палабедава Н.А.,
дацэнт

## АГУЛЬНАТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПЫТАННІ ІНТЭНСІЎНАГА НАВУЧАННЯ ЧЫТАННЮ

Навучанне чытанню арыгінальнай літаратуры па спецыяльнасці мае вялікае значэнне для эфектыўнасці выкладання замежнай мовы. Уменне чытаць спецыяльную літаратуру з'яўляецца для выпускніка вышэйшай навучальнай установы адным з галоўных аспектаў валодання замежнай мовай. І задача выкладчыка заключаецца ў тым, каб даць навучэнцу ў гэтым неабходны і дастатковы мінімум ведаў і навыкаў, г.зн. адабраць з моўнай сістэмы тыя з'явы, якія асабліва важныя для хуткага авалодання чытаннем. Выкладчык павінен тлумачыць іх такім чынам, каб забяспечыць непасрэднае выкарыстанне гэтых ведаў у практыцы чытання, а потым з дапамогай мэтанакіраваных практыкаванняў сфарміраваць аўтаматычныя навыкі разумення іншамоўнага тэксту. Такі падыход да навучання чытанню разглядаецца як інтэнсіўны.

Да ліку асноўных метадычных палажэнняў інтэнсіўнага навучання чытанню адносіцца ўспрыманне тэксту і сказа як цэласных адзінак у змястоўным і моўным плане. На гэтай асаблівасці тэксту базіруецца спецыфіка працэсу чытання, магчымасць яго прагназіравання. У змястоўным плане звязная структура тэксту дазваляе прагназіраваць яго логіка-кампазіцыйнае чляненне, сачыць за развіццём думкі і г.д., што абумоўлівае ўспрыманне змястоўнай інфармацыі тэксту. У моўным плане ўзаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць элементаў сказа, слова, словазлучэння дазваляюць ліквідаваць шматфункцыянальнасць і шматзначнасць граматычных формаў. Магчымасць моўнага прагназіравання закладзена ў аб'ектыўнай лінгвістычнай характарыстыцы ўсякага звязнага тэксту.

Навучанне разуменню ў працэсе чытання абапіраецца ў першую чаргу на авалоданне структурай мовы (яе элементамі і іх сувязямі), што з'яўляецца вельмі важным палажэннем інтэнсіўнага навучання чытанню. Навучэнец павінен ведаць адрознівальныя фармальныя адзнакі марфалагічных і сінтаксічных катэгорый. Рух думкі ад формы да значэння з'яўляецца асноўным пры чытанні іншамоўнага тэксту.

Яшчэ адным прынцыпам, асабліва важным менавіта для інтэнсіўнага курса навучання чытанню, які разлічаны на дарослую аўдыторыю навучэнцаў, з'яўляецца абагульненая перадача моўнага матэрыялу. Абагульненне моўных з'яў па адзнаках падобнасці формаў і значэнняў з паказаннем адрознівальных прымет дае магчымасць прадставіць часткі структурнай сістэмы мовы у больш агульным выглядзе. Гэта абумоўліваецца скарочаным тэрмінам навучання і неабходнасцю дасягнуць аўтаматызму ва ўспрыманні іншамоўнага тэксту.

Навучанне чытанню з'яўляецца актыўнай дзейнасцю. У метадычнай літаратуры адрозніваюць «разуменне - працэс» і «разуменне - вынік». У цэнтры ўвагі выкладчыка пры навучанні чытанню павінна быць «разуменне - працэс», г.зн. пэўная паслядоўнасць разважанняў па супастаўленню распазнавальных адзнак. «Разуменне - вынік» з'яўляецца дзякуючы правільна арганізаванай дзейнасці ў працэсе разумення.

Усе істотныя палажэнні навучання чытанню ўзаемазвязаны паміж сабой, абапіраюцца на разуменне мовы як структурна-арганізаванай сістэмы, а таксама на мэтанакіраваную метадычную ўстаноўку.

Кузьмініч Т.В.,
аспірантка

## ПЕРШАСНЫ ДАКУМЕНТАЛЬНЫ ПАТОК ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1982-1992)

Дакументальны паток (ДП) уяўляе сабой дынамічную сістэму, якая складаецца з мноства дакументаў, тэматычна і семантычна ўзаемазвязаных паміж сабой. Гістарычны дакументальны паток (ГДП) з'яўляецца часткай сусветнага ДП. Ён адлюстроўвае развіццё гістарычнай навукі і прадстаўлены сукупнасцю дакументаў, адпаведных сучаснаму ўзроўню выдавецкай справы, уключае ў якасці структурных адзінак мікрапатокі па асноўных састаўных прадметнай галіны.

Бібліяметрычны аналіз прадугледжвае вызначэнне колькасных паказчыкаў і структурных адзінак першаснага ДП. ГДП як сукупнасць упарадкаваных і ўзаемазвязаных носьбітаў гістарычнай інфармацыі адлюстроўвае стан і тэндэнцыі развіцця прадметнай галіны, тэматычную разнастайнасць дакументаў, жанравыя і тыпа-відавыя прыярытэты гістарычнай прадукцыі, моўную і геаграфічную размеркаванасць інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ДП па гісторыі ўключае ў якасці састаўных частак мікрапатокі па айчыннай гісторыі, спецыяльных гістарычных навуках (археалогіі і этнаграфіі), дапаможных гістарычных дысцыплінах, галінах гістарычнай навукі, гістарычных раздзелах айчыннай навукі, культуры, тэхнікі.

Геаграфічнае размяшчэнне, сацыяльна-эканамічныя і палітычныя асаблівасці развіцця Беларусі ўплываюць на фарміраванне ДП па яе гісторыі, якая фіксуецца ў шматлікіх гістарычных крыніцах, разнастайнай гістарычнай літаратуры, што ствараліся і ствараюцца ў межах розных дзяржаў. Маючы на ўвазе значны ўплыў канкрэтна-гістарычных умоў на фарміраванне ГДП, можна сцвярджаць, што пры існаванні ўласнай дзяржаўнасці ён складаецца з ДП, створанага на тэрыторыі Беларусі, і замежнага ДП, якія тычацца гісторыі Беларусі. Падчас уваходжання Беларусі ў склад іншых дзяржаў трэба разглядаць рэспубліканскі ГДП, ГДП той дзяржавы, часткай якой была Беларусь, замежны ГДП адпаведнай тэматыкі.

Удзельная вага ДП па гісторыі Беларусі адносна той часткі сусветнага патоку дакументаў, якія створаны на тэрыторыі Беларусі, суадносіцца з ёй па змесце ці аўтарскай прыналежнасці, складае за перыяд з 1982г. па 1992 г. прыкладна 4%. Амплітуда ваганняў нязначная. Павелічэнне тэмпаў росту ДП па гісторыі Беларусі і ўдзельнай вагі ў сусветным ДП назіраецца ў юбілейным 1985 годзе і з канца 1980-х гадоў, калі ўзмацніліся працэсы нацыянальнага адраджэння, склаліся ўмовы для альтэрнатыўнага разгляду падзей.

Тыпа-відавая структура першаснага ДП па гісторыі Беларусі прадстаўлена афіцыйнымі, навуковымі (крыніцазнаўчымі і навукова-даследчымі), навукова-папулярнымі, вучэбнымі, даведачнымі, гісторыка-мастацкімі, інфармацыйнымі выданнямі.

ДП па гісторыі Беларусі ўключае дакументы, створаныя на 23 мовах: беларускай, рускай, літоўскай, нямецкай, польскай, украінскай і інш. Актыўнасць ужывання той ці іншай мовы залежыла ад канкрэтных гістарычных умоў, падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі і ў якой ступені яны закраналі інтарэсы іншых дзяржаў. Асноўную частку ДП па гісторыі Беларусі за вызначаны перыяд складаюць беларускамоўныя і рускамоўныя дакументы. З другой паловы 1980-х гг. намецілася тэндэнцыя да павелічэння ўдзельнай вагі беларускамоўных дакументаў (найбольш паказальны ў гэтым сэнсе моўны склад кніжнай прадукцыі).

Тэматычная структура ДП па гісторыі Беларусі вызначаецца нераўнамернасцю размеркавання дакументаў па асобных гістарычных перыядах. Паслякастрычніцкаму перыяду прысвечана больш паловы дакументаў ад агульнай колькасці. З другой паловы 1980-х гг. удзельная вага гэтых дакументаў некалькі зніжаецца. Разам з тым назіраецца ўскладненне тэматычнай структуры (распрацоўваліся тэмы: БНР, рэпрэсіі таталітарнага рэжыму на Беларусі, антыфашысцкі рух у гады другой сусветнай вайны і інш.). З другой паловы 1980-х гг. вызначылася тэндэнцыя да павелічэння ўдзельнай вагі дакументаў, прысвечаных дакастрычніцкаму перыяду гісторыі Беларусі (у асноўным за кошт дакументаў па сярэднявеччу, публікацый аб выдатных дзеячах мінулага).

Каламіец В.І.,
дацэнт

## ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА І АВАНГАРД У ДЫЗАЙНЕ

Паняцці «канструктывізм», «вытворчае мастацтва», «функцыяналізм» знаходзяцца ў аснове прафесійнага самаўсведамлення дызайнераў і метадаў іх дзейнасці. Яны ж уваходзяць у шэраг такіх паняццяў, як «футурызм», «супрэматызм», «кубізм» і інш., якія акрэсліваюцца адным словам - «авангард». Ён аказаў значны ўплыў на культуру, мастацтва і дызайн.

Светапоглядна і метадалагічна паняцце «авангард» знаходзіцца ва ўзаемавыключальнай супярэчнасці з традыцыйнай культурай. Гэта паставіла дызайн у выключна механістычную ізаляцыяністскую пазіцыю.

Але ж гістарычна пасляваенная эвалюцыя светапогляду прывяла да змены прафесійнай парадыгмы ў дызайне. Ад ідэалогіі «функцыяналізму» дызайн павярнуўся да традыцыйных каштоўнасцей рэгіянальных культур, што азнаменавала з'яўленне новага напрамку ў дызайне - культуралагічнага.

Гэта абумовіла існаванне двух дызайнаў, накіраваных светапоглядна і метадалагічна ў розных напрамках, што паставіла ў тупік тэарэтыкаў, практыкаў і метадыстаў у дызайне.

На кафедры дызайну Беларускай акадэміі мастацтваў у курсе «Гісторыя дызайну» разглядаюцца роля авангарду ў станаўленні тэорыі і практыкі дызайну і змяненне светапоглядных пазіцый у дызайне на культуралагічныя, якія грунтуюцца на рэгіянальных каштоўнасцях матэрыяльнай культуры. Праводзіцца метадычная работа і па практычным выкарыстанні здабыткаў традыцыйнай культуры ў праектнай дзейнасці.

Гэта работа грунтуецца на тым, што дызайн існуе ў дзвюх «прасторах» - практычны, рэальны дызайн і тэарэтычныя ўяўленні аб ім. Пры іх паасобным аналізе тэарэтыка-светапоглядныя пазіцыі функцыяналісцкага і культуралагічнага дызайну выступаюць як праяўленне розных культурна-светапоглядных парадыгмаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ